**ПАДЗЕЯ**

# ЖЫЦЦЁ, ПРАЖЫТАЕ НА СЦЭНЕ

**СМАРГОНЬ. Спектакль па п’есе пісьменніцы з Астраўца Ніны Рыбік «Калядны вечар» змаглі ацаніць воіны-пагранічнікі. Аўтар твора, выканаўца галоўнай ролі, наша калега па Саюзе пісьменнікаў Беларусі Ніна Аляксееўна Рыбік падзялілася з намі гэтай навіной.**



*Гэтымі днямі ў пагранічнай часці 2044 у Смаргоні ў рамках пагаднення паміж Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Дзяржаўным пагранкамітэтам Рэспублікі Беларусь адбыўся паказ спектакля па маёй п’есе «Калядны вечар». Так сталася, што гэта быў юбілейны, 25 паказ. Магчыма (напэўна) – апошні.*

*Спектакль, пастаўлены народным (чытай: самадзейным) тэатрам з Астраўца, жыве 13 гадоў! Не кожны прафесійны можа пахваліцца такім даўгалеццем.*

*Мы 6 разоў паказвалі «Калядны вечар» у Астраўцы, двойчы – у Гродне, ставілі яго на сцэне Тэатра беларускай драматургіі ў Мінску, ездзілі з ім у горад-пабрацім Астраўца Сасновы Бор Ленінградскай вобласці (спектакль ішоў на беларускай мове, гледачы плакалі і смяяліся гэтак жа, як і ў Астраўцы). «Калядны вечар» праехаў амаль па ўсіх дамах культуры Астравеччыны, нас запрашалі ў Ашмянскі, Смаргонскі, Пастаўскі, Гродзенскі раёны. У мінулым годзе ён атрымаў Гран-пры фестываля «Лідскія тэатральныя сустрэчы». Здаецца, зрабілі ўсё, што маглі.*

***Ніна РЫБІК***
***САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ***
***ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ***

***На здымках:*** народны тэатр з Астраўца і яго спектакль «Калядны вечар» у гасцях у пагранічнікаў. Горад Смаргонь, Гродзенская вобласць. Лістапад 2025 года.


СМОРГОНСКАЯ ПОГРАНИЧНАЯ ГРУППА
















www.pisateli.by